24.03.2015

# Прэзентацыя факсімільнага выдання “Тураўскае Евангелле”



*26 сакавіка* 2015 года ў 15 гадзін у *аддзеле перыядычных выданняў* ДУК “Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я.Ф.Карскага” (вул. Замкавая, 20) адбудзецца прэзентацыя факсімільнага выдання кніжнага помніка старaславянскай пісьменнасці XI ст. – “Тураўскае Евангелле”.

Факсімільныя копіі надрукаваны ў Рэспубліцы Беларусь па ініцыятыве Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі тыражом 500 экз. з выкарыстаннем навейшых тэхналогій.

Перавыданне Тураўскага Евангелля стала працягам доўгатэрміновага праекта кампаніі Xerox і Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі па аднаўленні беларускіх помнікаў пісьменнасці і азнаямленні з імі шырокай грамадскасці. У межах гэтага праекта ў 2012 годзе быў выдадзены віленскі “Букварь” 1767 года, які захаваўся да нашага часу. Прадугледжваецца працяг рэалізацыі падобных праектаў і выпуск факсімільных копій іншых унікальных помнікаў кніжнай культуры.

Тураўскае Евангелле – самы старажытны помнік кніжнай культуры, створаны на тэрыторыі сучаснай Рэспублікі Беларусь. Рукапіс быў знойдзены ў 1865 годзе ў Тураве і з тых часоў захоўваецца ў Бібліятэцы Акадэміі навук Літвы імя Урублеўскіх (г.Вільнюс). Помнік уяўляе сабой Евангелле з дадатковымі запісамі, два з якіх былі зроблены ў пачатку XVI ст. ад імя князёў Астрожскіх.

У прэзентацыі прымуць удзел: прадстаўнікі абласнога выканаўчага камітэта, Гродзенскай Праваслаўнай Епархіі, кіраўніцтва Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, навукоўцы, краязнаўцы, спецыялісты бібліятэк і музеяў.

Падчас прэзентацыі адбудзецца перадача ўнікальнага дакумента бібліятэчным і музейным установам нашай вобласці.

Даведкі па тэл.: 73-81-05, 72-34-55.